А.Я.Федусь,
*выкладчык, сябра*
*Саюза мастакоў Беларусі*

# МАСТАЦКІ ФАРФОР І ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ КЕРАМІКІ

У галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, адным з відаў якога з'яўляецца мастацкая кераміка, асобнае месца належыць мастацкаму фарфору.

Зразумела, што без тэарэтычнага асэнсавання народнага мастацтва нельга правільна вызначыць арыенціры яго далейшага развіцця. Значэнне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у прыватнасці і традыцыйнага, народнага, заключаецца ў тым, што яно выхоўвае ў чалавека адчуванне прапорцый, гармоніі. А гэта садзейнічае выхаванню здольнасці ўспрымаць цэльнасць і дасканаласць прыроды, навакольнага свету, што, у сваю чаргу, выклікае моцную эстэтычную асалоду і такім чынам аздараўляе чалавека духоўна. Прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва даюць нам магчымасць атрымаць уяўленні аб асаблівасцях духоўнага складу народаў далёкай мінуўшчыны.

Каб зразумець шлях развіцця дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, неабходна прасачыць яго гісторыю, зразумець працэсы, што ў ім адбываліся і якім чынам уздзейнічалі на яго. Адносна керамікі падкрэслім, што яна суправаджала жыццё чалавека на працягу многіх тысячагоддзяў, пачынаючы з таго часу, калі былі адкрыты каштоўнейшыя якасці гліны як матэрыялу. У спалучэнні з вадою гліна, дзякуючы яе пластычнасці, дазваляе лёгка набываць любую форму, а пасля абпалу пераўтвараецца ў камнепадобную масу. У прыродзе не існуе матэрыялу, больш прыдатнага для вырабу посуду, чым гліна. З гэтым матэрыялам працавала асобная катэгорыя людзей, якія называлася ганчарамі. Ганчар, калі ён у душы быў мастаком, сапраўдным творцам, кожны наступны твор



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

імкнуўся стварыць лепш, чым папярэдні. Выконваючы на працягу пэўнага часу, здавалася б, адну і тую ж работу, (напрыклад, гаршчкі, патрэба ў якіх была заўсёды), ён не ўспрымаў сваю працу як аднастайную і надакучлівую, бо гэты працэс для яго быў творчым.

У наш час неабходнасць масавага выкарыстання гаршчкоў, керамічных місак і іншых вырабаў з ганчарнай чырвонай гліны значна зменшылася. Прычынай таму з'яўляюцца ўмовы жыцця і быту народа, якія значна змяніліся, з'явіліся новыя матэрыялы, такія як шкло і фарфор. Ва ўмовах высокамеханізаванага сучаснага спосабу вытворчасці ў галіне вырабу прадметаў з фарфору малавытворчы ганчарны спосаб стаў непрадукцыйным. На сучасных фарфоравых заводах пошукамі найбольш дасканалых у мастацкіх адносінах вырабаў займаюцца мастакі-прафесіяналы, якія маюць сярэднюю, а часцей вышэйшую мастацкую адукацыю. Мастак-прафесіянал або пад яго непасрэдным кіраўніцтвам вопытны майстар-мадэльшчык выбрабляе згодна з эскізам ці праектам аўтара гіпсавую мадэль будучага твора. Гэтая мадэль робіцца з такой руплівасцю і дасканаласцю, што не патрабуе далейшай апрацоўкі.

Варта адзначыць, што народныя майстры вельмі рэдка звярталіся да вырабу набораў посуду, або сервізаў, што патрабуюць стылявога адзінства як аднаго з галоўнейшых кампазіцыйных якасцей. Калі ж такія спробы і былі, яны з-за адсутнасці дастатковага вопыту майстра ў справе кампазіцыйнага майстэрства вельмі рэдка дасягалі высокага мастацкага ўзроўню.

Сёння ў асяроддзі мастакоў і мастацтвазнаўцаў можна пачуць меркаванне, быццам той, хто зрабіў сервіз, зможа зрабіць усё. Справа ў тым, што ўменне зрабіць сервіз сведчыць не толькі пра здольнасці практычна прымяняць сучасныя дасягненні ў галіне скульптуры, жывапісу і графікі, але і пра адчуванне асаблівасцей сучаснай архітэктуры і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фарфор — гэта той пластычны матэрыял, у якім керамічная тэхналогія дасягнула сваёй дасканаласці. За ўсю гісторыю развіцця ў чалавецтва не было больш прыдатнага і дасканалага матэрыялу для вырабу сталовага, чайнага і кававага посуду, чым фарфор.

Парадаксальна, што чым больш пашыраюцца ва ўмовах быту штучныя, сінтэтычныя матэрыялы, тым больш цэняцца матэрыялы натуральныя, прыродныя. Фарфор — адзін з натуральных, прыродных матэрыялаў, у аснове яго — чысцейшая прыродная белая гліна.

Фарфор не ўзаемадзейнічае з кіслотамі і шчолачамі, фарбы на ім не выгараюць, не ліняюць. Вырабы з фарфору больш моцныя і даўгавечныя, чым з чырвонай, так званай ганчарнай гліны, у дзесяткі, а то і ў сотні разоў. Вырабы са звычайнай ганчарнай гліны здольныя пераежыць некалькі чалавечых вякоў, а фарфор наогул можна лічыць матэрыялам вечным. Хаця тэарэтычна нічога вечнага не бывае, але ж ён не гарыць, не гніе, не размакае, яго можна разбіць і толькі такім чынам знішчыць.

Дзякуючы якасцям фарфору як матэрыялу, ён прыдатны для стварэння унікальных высокамастацкіх твораў, выкарыстоўваецца ў скульптуры і графіцы, на яго аснове можна выконваць самы дасканалы і тонкі жывапіс.

Фарфор на працягу стагоддзяў быў элітным матэрыялам. Не выпадкова назва “фарфор” паходзіць ад арабскага слова “фахфурты”, што азначае “імператарскі”. Яму адводзілася дэкаратыўная роля, а масавыя ганчарныя вырабы часцей за ўсё задавальнялі утылітарныя патрэбы шырокіх слаёў простага люду.

У наш час фарфоравы посуд стаў масавым, ён укараніўся ў паўсядзённы быт сучаснага чалавека.

Фарфор і вырабы ганчарства быццам памяняліся месцамі: фарфор пачаў выконваць больш утылітарную ролю, а са звычайнай ганчарнай гліны пачалі выраблядь сувеніры і разнастайныя дэкаратыўныя мастацкія вырабы для аздаблення інтэр’ераў. Гэта вельмі цікавы факт



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узаемадзеяння мінулага і сучаснага ў працэсе развіцця народнага мастацтва. У выніку мастацкая кераміка падымаецца на больш высокі ўзровень, і гэта дасць магчымасць павысіць прэстыж беларускай керамікі на міжнароднай арэне.

Разважаючы аб мінулым і сучасным народнага мастацтва, а таксама аб асноўных тэндэнцыях яго адраджэння і развіцця ў наш час, уяўляецца магчымым зрабіць практычныя высновы, як будаваць навучальны працэс у галіне падрыхтоўкі спецыялістаў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ведаючы асноўныя перыяды ў развіцці гэтага віду народнага мастацтва, неабходна будаваць вучэбную праграму так, каб студэнт за перыяд свайго навучання мог засвоіць працэс стварэння зрэзкаў-эталонаў як посуду, так і дэкаратыўна-мастацкіх вырабаў для масавай вытворчасці, а таксама высокамастацкіх, унікальных выставачных твораў з фарфору і фаянсу.

Развіццё народнага мастацтва заўсёды ішло шляхам перадачы прыёмаў і сакрэтаў майстэрства, традыцый непасрэдна ад настаўніка да вучня. Кожны майстар вучыўся ў свайго настаўніка. Але ж у каго вучыўся той, тэарэтычна першы майстар, у якога не было папярэднікаў, настаўнікаў, ад якога б ён пераймаў традыцыі? Той майстар вучыўся ў прыроды, асэнсоўваючы дасканаласць прыродных, перш за ўсё аб'ёмных формаў. Таму ў першую чаргу трэба звяртаць увагу студэнтаў на тое, каб яны маглі бачыць асаблівае ў прыродзе, пачынаць працу з самага простага, нават прымітыўнага, умелі імітаваць убачанае. Студэнты павінны асвоіць тэхніку работы на ганчарным станку, працэс стварэння эталонаў-узораў посуду для масавай вытворчасці, а таксама высокамастацкіх, унікальных выставачных твораў з фарфору і фаянсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ